жр 3223

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

Библиотека АН БССР

# Калгаснік Копыльшчыны

Орган Копыльскага РК КП(б)Б

№ 71 (1728) | Панядзелак 12 ліпеня | 1943 г.

**СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!**

**На Орлоўска-Курскім і Белгарадскім напрамках нашы войскі паспяхова адбіваюць усе атакі танкаў і пяхоты наступаючага праціўніка.**

**За 3 дзен упартых баёў падбіта і знішчана 2622 нямецких танкаў. У паветраных баях и зенитнай артылерыяй збіта 1126 самалетаў праціўніка.**

## На помсту нямецкім акупантам

Два гады ненависныя нямецкия захватчыки, як шакалы, цырзаюць и знишчаюць мирнае насельництва. За гэты час фашыцц ня палачы замучыли пытками, жывыми спали и, павесили и расстралялі тольки у Копыльским раёне больш 6000 ни у чым невинаватых мирных совецких грамадзян, жанчын, старыкоў и дзяцей.

Николи працоуныя раёна не забудуць и не даруюць нямецким крывапийцам и их прыслужникам палицэйским масавага знишчэння мирнага насельництва у Копыли, Прусах, Жавалках, Калодзезным, Масевичах, Пясочным, Рычэ, Свиласичах, Арэхаўцы и иншых вёсках.

Нямецка-фашысцкия людаеды, рабуючы гаспадарку багатых калгасаў раёна, спалили больш тысячы двароў калгаснікаў разам з усёй их маёмасцю.

Ад багатых и квитнеючых совецких сёл—Старыцы, Вялікай Раёўки, Прус, Руднага, Жавалак, Калодзезнага, Масевич, з их школями, клубами, бальницами и сельмагами, засталися тольки папялишча. Их датла спалили нямецкия акупанты.

Руины, виселицы, магилы —вось сляды двухгадовага разбойницкага гаспадарничання и жорсткага тэрору нямецка-фашысцких людаедаў у нашым раёне.

Але неглядзячы на жорстки тэрор, нямецким акупантам не удалося зламаць у совецких людзей волю и упэўненасць у барацьбе за вызваленне нашай совецкай зямли ад фашысцкай поганы.

Тысячы совецких патрыётаў пашли у партызанскиа атрады и жорстка мсцяць нямецким акупантам, за гора и муки совецких людзей. Ужо не адна сотня гитлераўцаў нашла сабе магилу на калгаснай зямли Копыльшчыны.

Кожны дзень павялічваецца у Копыли лик магил нямецких салдат и афицэраў, жандармаў и палицэйских, як сведак усе узрастаючай народнай помсты.

Сёння, кали на совецка-нямецким фронце идуць жорсткия баи танкаў, пяхоты и авияцыи, кали воины Чырвонай Армии стойка и мужна адбиваюць шматликия атаки нямецка фашысцких полчышч, свяшчэнны абавязак кожнага совецкага патрыёта, яки знаходзицца у тылу ворага, усилиць удары па яго тылавым камуникацыям, бязлитасна биць праклятую немчуру.

На помсту нямецким людаедам павинны падняцца усе працоуныя нашага раёна.

Таварышы, сяляне, рабочыя и совецкая интэлигенцыя яшчэ вышэй падымайце сцяг барацьбы супроць ненависных акупантаў. Ставанцеся у рады партызанских атрадаў, дапамагайце Чырвонай Армии биць ворага.

Не давайце акупантам мяса, хлеба, зрывайце угон у Германию моладзи. Акружайце ненависцю и прэзрэннем усих тых хто прадаўся немцам, хто пашоў на службу да их. Сваёй актыўнай барацьбой супроць акупантаў прыближайце час свайго вызвалення.

## НА ФРАНТАХ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

**(Агляд ваенных дзеннику за тыдзень з 5 па 11 ліпеня)**

Восьмы дзень на зямли и у паветры идуць вялікия баи на Орлоуска-Курским и Белгарадским напрамках совецка-германскага фронту.

З раницы 5 липеня нямецка-фашысцкия войски вяликими силами танкаў и пяхоты пры падтрымцы шматликай авияцыи перайшли у генеральнае наступленне супроць нашых войск.

Сканцэнтраваўшы на Орлоуска-Курским и Белгарадским напрамках 30 дывизии, у тым лику 15 танкавых, адну мота дывизию, 14 пяхотных и вялікую колькасць самалётаў, перакинуўшы шматликия злучэнни авияцыи з других вучасткаў совецка германскага фронту и з Заходняй Еуропы, праціўник раз ічвау уводам вялікіх сил войск, танкаў и авияцыи на вузким участку фронта, хутка зламаць совецкую абарону и ужо у першыя дни наступлення дабицца значных аператыўных вынікаў.

Нашы войски моцна утрымливаюць займаемыя рубяжы и адбиваюць усе шматликия атаки вялікіх сил танкаў, пяхоты и авияцыи праціўника.

За тыдзень жорстких баёў нашы войски падбили и спалили 2500 нямецких танкаў, у тым лику некальки сот танкаў тыпу „Тыгр". У паветраных баях и зенитнай артылерыяй збита 1038 самалетаў, забита да 60 тысяч салдат и афицераў праціўника.

жр 3223



# Магілы і папялішчы

Прыгожая была вёска Жавалкі. Заможна и культурна жыли калгасники Ворарами на шырокай калгаснай вулицы ярка гарели электрычныя фанары. Весела свяцила лампачка Ильича у кожнай сялянскай хаце.

Багаты быу калгас „Чырвонаармеец". Чатыры фермы давали вялики прыбытак. На СТФ было да 700 штук свиней. МТФ налицвала 400 штук буйнай рагатай жывёлы и маладнякa. 160 добрых коней, многа авец, кролікау, вялікую пчолапасеку, 850 гектарау добрай, урадливай зямли, 25 гектарау саду-мели калгаснікі.

На калгасным полi працавали трактары, камбайны и иншыя сельска-гаспадарчыя машыны.

Весела и культурна праводзили калгаснiки час адпачынку. У вяликим, прыгожым клубе часта бывала гукавое кино. У хапе-чытальни слухали радыё, чытали газеты и книжки. А кольки радасци и вяселля было на вечарах самадзейнасци калгаснай моладзи.

У прыгожым будынку змяшчалася школа. Далёка чутны были звонкия, жыцця радасныя песни дзяцей. За гады савецкай улады з вёски вышла больш 30 настаунікау, дзесятки камандзірау Чырвонай Армии, многа дактароу и иншых спецыялистых. Моладзь навучалася у вышейшых и сярэдних навучальных установах.

И вось прышла дзикая арда фашысцких разбойникау и душагубау. Настала гора замест радасцi и вяселля.

У першыя месяцы нямецкия акупанты аграбили калгас, забрали жывёлу и хлеб. Зимою гэтага году гитлерауския разбойники учынили у Жавалках страшэннае злачынства. Раницой, калі усе сяляне былі дома, нямецкия бандыты расстралялі у хатах усих людзей у тым лику старыкоу, жанчын и дзяцей, а хаты з трупами забитых запалили. Так гитлерауския палачы зверски забили больш 600 чалавек нявиннага мирнага насельництва и спалили усю вёску.

Некальки дзён абгарэлыя трупы и косци спаленых людзей валялися на папялишчах и тольки были пахаваны сялянами суседних вёсак.

Квитнеючую савецкую вёску фашысцкия людаеды ператварыли у магилки.

Вось яки „новы парадак" прынесли нам гитлерауския „вызвалицели".

Сыны и дочки беларускага народу, бярыцеся у руки зброю и помсцице гитлерау скім забойцам.

Помсцице за спаленыя вёски, за тысячы расстреляных, павешаных, спаленых и замучаных нашых братоу и сясцер, бацькоу и мацярэй, жонак и дзяцей.

**Сцяпан Д.**

# Дэсантныя аперацыі саюзнікаў на востраве Сіцылія

Лондан, 11 ліпеня. (Тасс). Штаб саюзных войск паведамляе, што войскі саюзнікаў зрабілі высадку дэсанта на востраў Сіцылію. Высадка дэсанта утваралася пры дапамозе авіяцыі, падтрыманай ваенна-марскімі сіламі. Амерыканскія часці прарвалі пярэднія умацаванні ў гэтым раёне.

Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, высадка войск утваралася ў розных мясцох працягам на 150 кіламетраў Сіцылійскага узбярэжжа. На востраў працягваюць прыбываць войскі, зброя, транспартныя сродкі, снаражэнне.

Першыя англійскія і амерыканскія парашутысты высаджаны на востраве Сіцылія 9 ліпеня ў 19 г. 20 мінут. Следам за парашутыстамі скінуты дастаўленыя на самалетах і букcіруемых імі планерах англійскія войскі. Дасягнуўшы зямлі, яны адразу знішчылі абарону праціўніка на ўзбярэжжы.

Парашутысты прызямліліся раней чым зенітная артылерыя праціўніка адкрыла агонь. Планеры і транспартныя самалеты працягвалі прыбываць не сустракая ніякага супраціўлення за выключэннем зенітнага агню.

* * *

Лондан, 11 ліпеня. Як афіцыйна паведамляецца, бамбардзіроўшчыкі саюзнікоў атакавалі ўчора аэрадромы праціўніка ў Сіцыліі, пункты сувязі, транспарт і другія непрыяцельскія аб'екты ва унутранай частцы вострава.

У ноч на 10 ліпеня авіяцыя саюзнікаў падвергла інтэнсіўным атакам аэрадромы праціўніка і іншыя яго аб'екты ў раёне высадкі дэсанта.

Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, разведывацельныя палеты паказалі, што некалькі галоўных аэрадромаў Сіцыліі прыведзены ў нягоднасць. На адным з аэрадромаў абнаружана ад 30 да 50 спісутых варожых самалетаў.

## ПРЫБЫЦЦЕ Ў АНГЛИЮ ВАЕННАГА МИНИСТРА ЗША СЦИМСОНА

Як перадае агенцтва Рэйтэр, ваенны міністр ЗША Сцімсон прыбыў у Англію. У час свайго прабывання ў Англіі Сцімсон сустрэнецца з камандуючым амерыканскімі ўзброеннымі сіламі на Еўрапейскім тэатры ваенных дзеянняў генералам Дэверсом і вышэйшымі грамадзянскімі і вайсковымі уладамі Англіі, праінспектыруе амерыканскія войскі, аэрадромы і другія вайсковыя аб'екты.

## БАМБАРДЫРОЎКА КЕЛЬНА

У ноч на 10 ліпеня англійская авіяцыя ўтварыла 119 налет на горад Кельн (Германія). У выніку бамбардыроўкі узнікла многа пажараў.

# Зверствы нямецкіх акупантаў

Гэта было зимою у дзень 25-ай гадавины Чырвонай Армии. На свинаферме саугаса имя Дзяржынскага быу абкружан немцами и палицыяй. Як быццам з мэтаю праверки дакументау, усих рабочых гитлерауцы сагнали у адзин барак. Калі усе з сем'ями были сабраныя, гитлерауския людаеды учынили нечуванае злачынства. Яны падпалили барак з жывыми людзьми, каб апошния не уцякли нямецкия бандыты безупынна стралялі па вокнах з кулямётау.

Двэнаццацигадоваму хлопцу Каську Лаваниду удалося выскачыць з агню. Жандарм злавиу яго и жывым кинуу у агонь.

Страшэннай смерцю загинули 64 чалавеки. Памираючы у полымя агню, у жудасных муках, бязвинныя ахвяры фашысцких бандытау праклинали и адпомсциць за их.

**Максім Ш.**

**РЭДКАЛЕГИЯ**